# Школьная планета

**_НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА САВЁЙ ПЛАНЕЦЕ! № 5 (25) Студзень 2016_**

_Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”Мінскай вобласці_

## 2016 год – год культуры ў Беларусі



_ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА 28 СНЕЖНЯ ПАДПІСАЎ УКАЗ НУМАР 522 "АБ АБ'ЯЎЛЕННІ 2016 ГОДА ГОДАМ КУЛЬТУРЫ". УКАЗ ПРЫНЯТЫ Ў МЭТАХ АБ'ЯДНАННЯ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫХ І ДУХОЎНЫХ СІЛ ГРАМАДСТВА ДЛЯ ВЫРАШЭННЯ ЗАДАЧ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ КРАІНЫ, ЗАХАВАННЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ, РАЗВІЦЦЯ НАРОДНЫХ ТРАДЫЦЫЙ, ВЫХАВАННЯ Ў ГРАМАДЗЯН ЛЮБОВІ ДА АЙЧЫНЫ, А ТАКСАМА ПАДТРЫМКІ ТВОРЧЫХ ІНІЦЫЯТЫЎ._

_ПЛАН МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ПА ПРАВЯДЗЕННІ Ў 2016 ГОДЗЕ ГОДА КУЛЬТУРЫ ЗАКРАНАЕ ЎСЕ СФЕРЫ ДЗЕЙНАСЦІ ЧАЛАВЕКА (КУЛЬТУРА ВЫТВОРЧАСЦІ І ЗЕМЛЯРОБСТВА, КУЛЬТУРА СЯМЕЙНЫХ АДНОСІН І БЫТУ, КУЛЬТУРА ДОБРАЎПАРАДКАВАННЯ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ)._

_ЗНАЧНАЯ ЎВАГА БУДЗЕ ЎДЗЕЛЕНА МЕРАПРЫЕМСТВАМ У СФЕРЫ МАСТАЦКАЙ КУЛЬТУРЫ, ЯКАЯ З'ЯЎЛЯЕЦЦА АДНЫМ З АСНОЎНЫХ СРОДКАЎ ВЫХАВАННЯ Ў МОЛАДЗІ ПАТРЫЯТЫЗМУ І ПАВАГІ ДА РАДЗІМЫ. ТАКСАМА ПРАДУГЛЕДЖВАЕЦЦА КОМПЛЕКС МЕРАПРЫЕМСТВАЎ, ЗВЯЗАНЫ СА ЗНАКАВЫМІ ДЛЯ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ ЮБІЛЕЙНЫМІ ДАТАМІ._

## Майстар-клас "Робім сувенірную ўпакоўку"



Прыемны падарунак не толькі яго зместам, але і афармленнем. Упакаваць рэч у прыгожую паперу не так і складана, а вось зрабіць арыгінальную ўпакоўку падарункаў сваімі рукамі - гэта ўжо мастацтва.

Падарунак, аформлены сваімі рукамі, набывае асаблівую каштоўнасць, укладаючы ў сябе станоўчую энергетыку блізкага чалавека. А зрабіць эксклюзіўную скрыначку для падарунка не так ужо і складана. Вось гэта нам і прадэманстравала на сваім майстар-класе настаўніца працоўнага навучання Губіч Галіна Міхайлаўна.





**_Дом, у якім утульна ўсім!_**

**berezino2.school.by** **vk.com/club59543714** ***№ 25, студзень 2016 г.***

# 2016 год – год культуры ў Беларусі

# Юбілейныя даты на 2016 год

*Студзень*
75 гадоў
з дня нараджэння
эстраднага спевака,
кампазітара
Уладзіміра Мулявіна



*Студзень*
95 гадоў
з дня нараджэння
пісьменніка
Івана Шамякіна



*Люты*
95 гадоў
з дня нараджэння
пісьменніка
Івана Мележа



*Сакавік*
120 гадоў
з дня нараджэння
крытыка,
байкапісца
Кандрата Крапівы



*Красавік*
130 гадоў
з дня нараджэння
пісьменніка
Змітрака Бядулі



*Май*
125 гадоў
з дня нараджэння
пісьменніка
Міхаіла Булгакава



*Чэрвень*
140 гадоў
з дня нараджэння
пісьменніцы
Цёткі
(Алаіза Пашкевіч)



*Чэрвень*
70 гадоў
паэту
Уладзіміру Някляеву



*Жнівень*
80 гадоў
з дня нараджэння
паэта, перакладчыка
Генадзя Бураўкіна



*Верасень*
85 гадоў
паэту
Нілу Гілевічу







*Снежань*
125 гадоў
з дня нараджэння
паэта
Максіма Багдановіча

Дом, у якім утульна ўсім!
berezino2.school.by vk.com/club59543714 № 25, студзень 2016 г.



# Ой, калядачкі, бліны-ладачкі, Ой, люлі-люлі, бліны-ладачкі.

Добры вечар таму,
Хто ў гэтым даму!
А ў гэтым даму
Слаўны гаспадар!

Такімі словамі віталі калядоўшчыкі – вучні 5 “Б” класа – тых, да каго рашылі зайсці ў шчодры вечар, каб пажадаць усяго найлепшага ў новым годзе, які нядаўна пачаўся.



Адкуль жа з’явіўся такі звычай ў беларусаў?

**Каляды – вельмі старажытнае свята.** У ім знайшлі ўвасабленне хрысціянскія і народныя абрады і традыцыі.

У хрысціян Калядамі лічыцца пражежак часу ад свята Нараджэння Хрыстова да Вадохрышча, святыя дні ўслаўлення Божага нараджэння і першых дзён Яго жыцця. Ісус Хрыстос з’явіўся на свет, каб каб збавіць людзей ад грахоў, навучыць іх дабру, згодзе і міласэрнасці, таму так шырока і ўрачыста адзначаюць свята хрысціяне.

У народнай жа традыцыі гэтыя святкі прысвечаны сонцу. Яно – магічная істота , якая дае жыццё ўсяму жывому, пасылае святло і цяпло. Нашы продкі верылі, што розныя жывёлы – “каза”, “мядзведзь”, “конь”, “журавель” - з’яўляюцца сімваламі здароўя і дабрабыту. Каб у людзей былі добры прыплод і ўраджай, моц, багацце, асабістае шчасце, а разам з імі і радасць, добры настрой, жыццёвая сіла і энергія, калядоўшчыкі апраналіся так, каб быць падобнымі на гэтых жывёл, і хадзілі ад аднаго двара да другога, віншуючы гаспадароў, жадаючы ім усялякіх даброт. Жарты, музыка, спевы, найлепшыя пажаданні ўздымалі настрой, выклікалі эмацыянальны ўздым, стваралі зарад бадзёрасці ў абодвух бакоў дзейства. За гэта гаспадары адорвалі калядоўшчыкаў смачнымі каўбасамі, салам, пірагамі, цукеркамі і іншымі ласункамі, асабліва ў шчодры вечар. Гаспадары таго двара, які абмінулі калядоўшчыкі, не чакалі нічога добрага ў новым годзе,



думалі-гадалі, што дрэннага яны ўчынілі ў мінулым годзе, стараліся не зрабіць больш памылак, якія маглі выклікаць такую няміласць.

Вось і нашы пяцікласнікі добра справіліся з роляй калядоўшчыкаў. Высока ўзняўшы яркую каляндную зорку, сімвал Каляд, узяўшы з сабою Казу-весялуху, пераапранутыя вучні пачалі калядаванне з роднай школы. У першую чаргу зайшлі ў настаўніцкую, прывіталі дырэктара і ўсіх, хто быў там у той час. Зычылі і добрага здароўя, і плёну ў працы, і шчасця ў сем'ях, і папаўнення рахункаў праз узнос на банкаўскія карткі ў выглядзе як беларускіх рублёў, так і валюты, спявалі вясёлыя прыпеўкі. Каза для дабрабыту прысутных абсыпала ўсіх зернем, не забыўшы сыпнуць у акенца, каб разбудзіць Сонца і ўлашчыць Мароз.



"Хто з Казою патанцуе, таму ў гэтым годзе пашанцуе," - абяцалі калядоўшчыкі, і кожны з прысутных меў жаданне патанчыць з Казою.

З прыўзнятым настроем дырэктар, яго наместнікі і настаўнікі шчодра пачаставалі Казу і яе акружэнне.

Павіншавалі калядоўшчыкі і сваіх малодшых сяброў, вучняў чацвёртага класа, якія ў час выступлення вясёлай каляднай кампаніі таксама набылі зарад станоўчых эмоцый, а пасля не забыліся аддзячыць за прыемныя словы і рытуальныя дзеянні.

Пасля нашы калядоўшчыкі накіраваліся за межы школы і супыніліся ў аддзеле па нарыхтоўках сельгаспрадукцыі і сыравіны Бярэзінскага РАЙПО, працоўны калектыў якога шчыра вітаў калядоўшчыкаў у сваёй арганізацыі. Толькі добры настрой, малады задор і станоўчыя эмоцыі прынеслі сюды пяцікласнікі. Яны парадавалі гаспадароў сваімі спевамі, найлепшымі, у тым ліку і гумарыстычнымі, пажаданнямі, танцамі з "памершай", а пасля "ўваскрошай" Казой. Гаспадары не паскупіліся на пачастункі для школьнікаў.



Задаволеныя, з добрым настроем вярнуліся дзеці ў школу. І не толькі поўная торба ласункаў радавала дзяцей. Яны судакрануліся са святам, адчулі сябе яго часцінкай. Той часцінкай, што нясе людзям цеплыню, дабрыню, радасць. А гэта заўсёды прыемна.

*Таццяна Зелянкевіч, настаўніца беларускай мовы і літаратуры*

# 10 самых знакамітых Таццян





<u>*23 студзеня 2016 года ў школе адбылося інтэлектуальна-пазнавальнае мерапрыемства для 7-8 класаў "Дзесяць самых знакамітых Таццян", прымеркаванае да святкавання Таццянінага Дня. Мерапрыемства мела пазнавальны характар, было накіравана на выхаванне маральных якасцяў навучэнцаў,на далучэнне да духоўных і культурных каштоўнасцяў.*</u>

## Калонка педагога-псіхолага

# 10 запаведзяў для бацькоў

*1. Не чакай, што тваё дзіця будзе такім, як ты, ці такім, як ты хочаш. Дапамажы яму стаць не табой, а сабой.*
*2. Не патрабуй ад дзіцяці платы за ўсё, што ты для яго зрабіў. Ты даў яму жыццё, як ён можа аддзячыць табе? Ен дасць жыццё другому, той - трэцяму, і гэта незваротны закон падзякі.*
*3. Не спаганяй на дзіцяці свае крыўды, каб у старасці не есці горкі хлеб. Бо што пасееш, тое і ўзыдзе.*
*4. Не стаўся да яго праблем пагардліва. Жыццё дадзена кожнаму па сілах, і будзь упэўнены, яму цяжка, не менш, чым табе, а можа быць і больш, паколькі ў яго няма вопыту.*
*5 Не прыніжай!*
*6. Не забывай, што самыя важныя сустрэчы чалавека - гэта яго сустрэчы з дзецьмі. Звяртай больш увагі на іх - мы ніколі не можам ведаць, каго мы сустракаем у дзіцяці.*
*7. Не муч сябе, калі не можаш зрабіць штосьці для свайго дзіцяці. Муч, калі можаш, але не робіш. Памятай, для дзіцяці зроблена недастаткова, калі не зроблена ўсё.*
*8. Дзіця - гэта не тыран, які авалодвае ўсім тваім жыццём, не толькі плод плоці і крыві. Гэта тая каштоўная чаша, якую жыццё дало табе на захаванне і развіццё ў ім творчага агню.*
*9 Умей любіць чужое дзіця. Ніколі не рабі чужому тое, што не хацеў бы, каб рабілі твайму.*
*10. Любі сваё дзіця любым - неталенавітым, няўдачлівым, дарослым. Радуйся, таму што дзіця - гэта свята, якое пакуль з табой.*

*Алена Кузіна, педагог-псіхолаг*

# Нашы Святыя Таццяны

*Калі ў Таццянін Дзень марозна і ясна – да ўраджаю; цяпло і мяцеліца - да неўраджаю.*

Таццяна - імя, якое мае грэчаскія карані і азначае яно “валадарка”. І на самай справе, калі ўспомніць вядомых жанчын з імем Таццяна (Лаўрова, Навка, Тарасава), сапраўды, яны валодаюць і валодалі вельмі моцным характарам, жаданнем ісці да канца і не перад чым не спыняцца, трапяткім клопатам аб людзях, жаданнем зрабіць свет больш гарманічным.

На жаль, у нашай школе не так шмат Таццян. Амаль што з усімі мы сустрэліся. І вось якія пытанні мы ім задалі:

- *Ці падабаецца вам ваша імя? Ці ведаеце вы, чаму і ў гонар каго вас так назвалі?*
- *Як вы адзначаеце гэта свята?*
- *Ці адчуваецы вы падтрымку сваёй нябеснай абаронцы – святой Таццяны?*

**Зелянкевіч Таццяна Мікалаеўна**
(настаўніца беларускай мовы і літаратуры)

*- Маё імя мне падабаецца, я ўжо настолькі прывыкла да яго, яно такое ласкавае майму слыху. Такім цудоўным імем мяне назвала любімая мама.*
*- Гэтае свята я не адзначаю, але ўсё ж мне прыемна, калі мяне віншуюць.*
*- Я адчуваю падтрымку ад святой Таццяны. Магчыма, яна і дапамагае нам, трэба ў гэта верыць!*



**Андрыевіч Таццяна Яўгеньеўна** (настаўніца фізічнай культуры і здароўя)

*- Імя вельмі падабаецца, так мяне назвала любімая і самая лепшая мама.*
*- Святкую гэтае свята па-простаму: чай і торцік ... Што яшчэ для шчасця трэба?*
*- На жаль, не адчуваю падтрымкі ад святой Таццяны, такое бывае ...*



**Жукоўская Таццяна Мікалаеўна** (педагог-арганізатар)

*- Вельмі падабаецца, так мяне назваў стрыечны брат, а маме спадабалася гэтае імя, яна палічыла што гэта проста і ў той жа час вельмі велічна.*
*- Раней, калі я была студэнткай, то адчувала падтрымку святой Таццяны, але цяпер - не.*

**Фядотава Таццяна Мікалаеўна**
(настаўніца пачатковых класаў)

*- Мне вельмі падабаецца гэта імя, мяне так назвалі, таму што я нарадзілася 11 студзеня, за два тыдні да Таццянінага дня.*
*- Так як мае пляменнікі – студэнты, яшчэ 25 студзеня ў дваіх маіх сваякоў дзень нараджэння, то мы святкуем гэтае свята ўсёй сям'ёй.*
*- Я адчуваю падтрымку святой Таццяны.*





**Шык Таццяна**, 5 "Б" клас

*- Матуля з дзяцінства марыла аб тым, калі народзіцца дзяўчынка, то гэта будзе Таня.*

*- Мяне часта віншуюць, але надараецца і падарункі атрымліваць.*

*- Калі-нікалі ў мяне прысутнічае такое пачуццё.*

**Федарынчык Таццяна**, 5"Б" клас

*- Мяне так назвалі па царкоўным календары.*

*- Мяне проста віншуюць бацькі, сябры і настаўнікі.*

*- Не, не адчуваю.*

**Даўгучыц Таццяна**, 11 "Б" клас

*- Вельмі падабаецца. Бацькі спачатку хацелі назваць мяне інакш, але бабуля прапанавала імя Таццяна.*

*- Калі-нікалі матуля купляе торцік, і мы п'ём чай.*

*- Адчуваю. Мне здаецца, што яна заўсёды са мной і заўсёды пдтрымлівае мяне.*



Магчыма, яны ўсе розныя, але яны ўсе выдатныя па-свойму, усе добрыя і ветлівыя, усмешлівыя і шчаслівыя.

Віншуем з Таццяніным днём! Хай святая Таццяна садзейнічае вам ва ўсіх пачынаннях. І няхай вашыя дасягненні і поспехі ў вучобе або рабоце стануць яшчэ адным упэўненым крокам да паспяховай кар'еры і шчаслівага жыцця. Жадаем вясёлага і яркага свята!

*Вайцяховіч Лізавета, Багуль Вікторыя, 9 "Б" клас*

# Юныя журналісты запрашаюць вас

## Наш дэвіз: "Шукай! Спрабуй! Рабі!"

Заняткі для пачынаючых журналістаў праходзілі ў гімназіі, а праводзіла іх Міхалёва Надзея Сяргееўна - кіраўнік клуба "Юны журналіст" ДУА "Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно. Заняткі аказаліся вельмі цікавымі і вясёлымі…

Было шмат карысных заданняў для журналістаў: "Якімі якасцямі валодае журналіст", "Прыдумваем назву для газеты", "Рэдакцыя", "Напішы артыкул і дай яму загаловак".

Удзельнікам заняткаў трэба было праявіць кемлівасць і знаходлівасць. Усе заданні і конкурсы зблізілі юных журналістаў. Вучні выдатна з усім справіліся. І ў канцы атрымаўся амаль што поўнасцю гатовы нумар школьнай газеты "Гімназіст сёння".

Заняткі былі пазнавальнымі і для вучняў гімназіі, і для журы, і нават для мяне.

Калі ласка, далучайцеся да нас. *Вайцяховіч Лізавета*








# ЗІМОВЫЯ ЗАБАВЫ





ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно"
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета "Школьная планета" выходзіць адзін раз у месяц. Творчы калектыў клуба "Юны журналіст": Галуза Яўгенія, Цэнкель Алена, Вайцяховіч Лізавета, Багуль Вікторыя, Власюк Марыя Маркевіч Ірына